# АСНОЎНЫЯ ПАЛАЖЭННІ СЯМЕЙНАГА ПРАВА БЕЛАРУСІ XIV–XVII стст. ПА СТАТУТАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

***М. А. Лапатко***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Само паняцце «сям'я» ў старажытных дакументах мела сэнс аб'яднання, злучэння, сумеснага двара, уладання. Навукоўцы адзначаюць, што па сваіх асноўных формах сем'і беларускіх сялян у перыяд феадалізму падраздзяляліся на малыя і вялікія (бацькоўскія і брацкія). Малая (або нуклеарная) сям'я складалася са шлюбнай пары і іх дзяцей. Вялікая сям'я мела больш складаны і шматлікі састаў, які, напрыклад у вялікай бацькоўскай сям'і, уключаў прамых сваякоў двух-трох пакаленняў (бацькоў, дзяцей, жанатых сыноў, унукаў), што мелі неразддзеленую прыватную ўласнасць, вялі сумесную гаспадарку пад кіраўніцтвам старэйшага мужчыны (бацькі). Распад вялікіх сямей адбываўся тады, калі колькасць іх членаў павялічвалася і вядзенне агульнай гаспадаркі рабілася немагчымым. Аднак раздзяленне сям'і было часта эканамічна нявыгадным, паколькі вяло да драблення сямейнай уласнасці (інвентару, жывёлы і інш.).

Распарадчыкам і намінальным галавой як малой, так і вялікай (бацькоўскай, брацкай) сям'і быў старэйшы мужчына, а ў выпадку смерці – яго жонка (пры адсутнасці ў сям'і дарослага сына). У выпадку смерці бацькоў сыны маглі ўступаць у правы ўжо пасля 12 гадоў.

Становішча жанчыны ў сялянскіх сем'ях Беларусі таго часу было не аднолькавае са становішчам мужчын. Аднак жанчына не знаходзілася пад дэспатычным прыгнётам мужа і мела права голасу. Жорсткае абыходжанне мужа з жонкай было даволі рэдкай з'явай, аднак звычай у такіх выпадках даваў жанчыне права пакінуць мужа, што было раўназначна разводу.

Ужо ў Статуце 1529 г. ёсць норма, якая забараняла выдаваць замуж супраць волі, а толькі са згоды княгінь, удоў і дзяўчат (арт. 15). Як піша Я. А. Юхо, гэта датычалася пануючага класа і зусім не закранала дзяўчат-чэлядзінак і простых жанчын, якіх маглі выдаваць прымусова.

У адпаведнасці са Статутам 1566 г. дзяўчына павінна была атрымаць дазвол бацькоў. Калі дачка брала шлюб без іх дазволу, то яна пазбаўлялася пасагу, а таксама маёнткаў бацькі і маці (арт. 7). Артыкул 12 устанаўліваў тэрмін, на працягу якога жанчыне забаранялася браць шлюб пасля смерці мужа. Іх працягласць складала 6 месяцаў.

Як адзначае прафесар Я. А. Юхо, ў Статутах нічога не сказана пра працэдуру заключэння шлюбу. Яна рэгламентавалася нормамі звычаёвага

права. Заключэнне шлюбу ажыццяўлялася ў некалькі этапаў: сватаўство і агледзіны, заручыны (змовіны), шлюб і вяселле. Сватаўство і агледзіны, як падрыхтоўчае дзеянне, ніякіх прававых наступстваў не цягнулі. Прававыя наступствы надыходзілі толькі пасля заручын. Старана, якая адмовілася ўступіць у шлюб пасля заключэння дамовы аб шлюбе – змовін, абавязаная была пакрыць іншай старане ўсе панесеныя выдаткі па падрыхтоўцы да шлюбу і выплаціць абумоўленую дамовай няўстойку.

Заручыны часта адбываліся яшчэ ў дзіцячым узросце. У гэтым выпадку заключаўся вясельны дагавор, у якім вызначаўся пасаг нявесты. Жанчына мела так званае «вено» – права на валоданне адной трэцяй часткі маёмасці сям'і пасля смерці мужа пры адсутнасці ў іх сыноў. Асноўнымі бакамі дамовы, якая складалася пры заручынах, выступалі бацькі, блізкія сваякі або апякуны тых, хто уступаў у шлюб. Калі ў сям'і мелася некалькі дзяўчын, то абавязкова трэба было раней выдаць старэйшую, а затым наступную за ёй па ўзросту.

Па Статуце 1566 г. шлюбны ўзрост для дзяўчын быў усталяваны з 15, а для юнакоў – 18 гадоў, але ў Статуце 1588 г. шлюбны ўзрост для дзяўчын усталёўваўся з 13 гадоў. Гэта сведчыць, што дзяржава актыўна ўмешвалася ў шлюбна-сямейныя адносіны.

## СТАТУС ВОЗНЫХ ПА СТАТУТАХ ВКЛ

***А. А. Міхневіч***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

Нельга забыцца яшчэ пра адзін цікавы прававы інстытут, які ўзнік на тэрыторыі ВКЛ у тыя часы – інстытут возных. Гэты інстытут, як і інстытут прафесійных суддзяў, з'явіўся ў ВКЛ толькі з выданнем Статута ВКЛ 1566 г. Возныя выконвалі функцыі судовага следчага, выканаўц і кур'ера адначасова. Як і суддзёй, возным не мог стаць просты селянін. Аселы шляхціч з пэўным прыбыткам – другая справа: «...выбирали пострыгали уставляли тежъ шляхту людей добрихъ вѣры годныхъ цнотливыхъ оселыхъ въ томъ же повѣтѣ...» Адпаведна арт. 5 Статута ВКЛ 1566 г. возныя не толькі развозілі павесткі ў суд (позвы), аднак яшчэ пры неабходнасці выконвалі функцыі сучаснага следчага, а часамі і эксперта: праводзілі агляд месца злачынства, экспертызы, допыт сведкаў.

У другім статуце з'явілася паняцце недатыкальнасці вознага, аналагічна недатыкальнасці суддзі, падсудка, пісара. Так, па арт. 6 кожны нёс адказнасць, калі б ён украў у вознага выканаўчы ліст, а таксама адказваў за яго дастаўку. За гэты ўчынак кожны быў павінен знаходзіцца пад арыштам у турме (турэмным замку) не меней шасці тыдняў у залежнасці ад стану і сацыяльнага паходжання. У артыкуле 11 Статута